*Іванова В. С.,*
*аспірант кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага універсітэта*

## Асабістыя архівы ў латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі

Латышскі і беларускі народы маюць не толькі агульную мяжу, але і даўнія гістарычныя традыцыі шчыльных эканамічных, палітычных і культурных стасункаў. Да 1920 г. Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы ўваходзілі ў межы адной адміністратыўна-тэрытарыяльнай адзінкі — Віцебскай губерні, таму дзейнасць вядомых латышоў, што паходзілі з гэтых земляў, аказала значны ўплыў на развіццё навукі і культуры не толькі Латвіі, але Беларусі і Літвы. У XIX — першай палове XX ст. з Латвіяй была звязана дзейнасць многіх беларусаў: І. Буйніцкага, З. Жылуновіча, В. Ластоўскага, К. Каганца, Б. Эпімах-Шыпілы і інш. Асабістыя архівы прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі ў Латвіі, якія разгарнулі шырокую грамадска-культурную і асветніцкую дзейнасць у 1920—1940-я гг., С. Сахарава, У. Пігулеўскага, І. Краскоўскага ў пасляваенны перыяд былі перададзены спадчыннікамі ў аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, асабісты фонд К. Езавітава захоўваецца ў НАРБ.

Асноўнымі сховішчамі ў Латвіі, дзе захоўваюцца дакументы асабістага паходжання, з'яўляюцца: Дзяржаўны архіў Латвіі (ДАЛ), які камплектуецца асабістымі архівамі дзеячаў латышскай культуры, навукі, літаратуры, мастацтва пасляваеннага перыяду з 1972 г. і налічвае ў сваіх сховішчах больш за 240 асабістых фондаў[1]; Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі (ДГАЛ), што захоўвае дакументы да 1944 г., у тым ліку асабістыя фонды, калекцыі дакументаў асабістага паходжання, фамільныя архівы[2]; аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Латвійскай Нацыянальнай бібліятэкі, а таксама шэраг цэнтральных і рэгіянальных музеяў.

Культурныя і навуковыя ўзаемапранікненні можна праілюстраваць на прыкладзе дзейнасці двух выдатных архівістаў, латышоў па паходжанні, Івана Якаўлевіча Спрогіса (20.06.1833, м. Штокмансгоф, Ліфляндская губ. — 19.07.1918) і Баляслава Рычардавіча Брэжга (31.01.1887, Рэжыцкі пав., Віцебская губ. — 30.07.1957) і лёсе іх асабістых архіваў.

І. Я. Спрогіс, паходзячы з сям'і праваслаўных латышскіх сялян, больш за пяцьдзесят гадоў аддаў працы ў Віленскім цэнтральным архіве старажытных актавых кніг. Асноўная частка яго асабістага архіва ў колькасці больш за 5 тыс. спраў захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага універсітэта. У ДГАЛ у асабістым фондзе І. Я. Спрогіса захоўваецца ўсяго 13 спраў, якія, аднак, могуць стаць каштоўнейшай крыніцай для даследаванняў беларускіх, латышскіх, літоўскіх, расійскіх гісторыкаў і архівістаў. Гэта 10 нататнікаў, у сярэднім па 150 аркушаў, з дзённікавымі запісамі І. Я. Спрогіса за 50 гадоў з часу яго пераезду ў Вільню ў 1864 г. і да пачатку Першай сусветнай вайны ў 1914 г., а таксама справа з успамінамі А. У. Жыркевіча[3] аб І. Я. Спрогісе, напісанымі ў Коўна 28 верасня 1926 г. У вопісе значацца яшчэ дзве справы з біяграфічнымі дакументамі І. Я. Спрогіса, якія, на жаль, прагледзець не атрымалася.

Лёс дзённікаў ужо сам па сабе выклікае значную цікавасць, закранаючы пытанні калекцыяніравання дакументаў асабістых архіваў у другой палове XIX — пачатку XX ст., і праблемы архіўнай рэстытуцыі ў 1920-я гг. пасля ўтварэння незалежных дзяржаў на абшарах былой Расійскай імперыі.

Вядомы віленскі калекцыянер, літаратар і ваенны юрыст Аляксандр Уладзіміравіч Жыркевіч (1857—1927), падтрымліваючы цесныя стасункі з інтэлігенцыяй Паўночна-Заходняга края К. Галкоўскім, Т. Даўгірдам, А. Наўроцкім, Э. Ажэшка, вядучы актыўную перапіску з прадстаўнікамі рускай культуры пісьменнікамі М. С. Лясковым, Я. П. Палонскім, В. С. Салаўёвым, А. А. Фетам, А. П. Чэхавым, Л. М. Талстым, мастакамі І. Е. Рэпіным, В. В. Верашчагіным і іншымі, папоўніў сабранымі дакументамі і прадметамі не адзін дзесятак расійскіх, польскіх, літоўскіх бібліятэк і музеяў. З пачаткам Першай сусветнай вайны, набліжэннем фронта да Вільні, Жыркевіч заклапаціўся лёсам сваіх збораў: «В эти дни я спрятал от чужеземцев мой личный архив: имел надежду его вывезти за пределы театра военных действий, вот почему Спрогис и отдал мне свои мемуары, драгоценные для России, Латвии и Северо-Западного края (в частности) … В те дни, когда у меня шла беседа со старым другом о судьбе его личного архива (главным образом, дневников) … просил Ивана Яковлевича отдать мне эти интересные документы. Но тогда встретилось противодействие его супруги, не желавшей, по ее словам, чтобы подобная переписка, в которой находились и вопросы, касавшиеся семейной жизни, попав в частные руки, получили когда-либо огласку. Сам Спрогис не придавал этим заметкам особого значения (но тогда зачем же он так бережно хранил их!?)»[4]. Дзённікі павандравалі разам з А. Жыркевічам у Сімбірск, а ў 1925 г. у складзе яго багацейшага архіва былі перададзены ў Дзяржаўны музей імя Л. М. Талстога ў Маскве (быў утвораны ў 1911 г.)[5]. Вярнуўшыся ў Літву, Жыркевіч сустракае шчырую цікавасць да дзённікаў з боку латвійскага пасла ў Коўне Балодзіса і робіць заяву ў Талстоўскі музей з просьбай перадаць дзённікі ў Латвію[6], што і было зроблена. Такім чынам, перадачы дзённікаў спрыяла, па-першае, тое, што яны доўгі час належалі прыватнай асобе, воля якой шмат у чым вызначала лёс дакументаў; па-другое, такі прэцэдэнт наўрад ці мог мець месца без наяўнасці ў Мірнай дамове паміж Расіяй і Латві-

яй ад 11 жніўня 1920 г. артыкула аб звароце дакументаў, што маюць гістарычнае значэнне для латышскага народа[7].

Аб лёсе іншых дакументаў, сабраных Жыркевічам, у тым ліку тых, што маюць дачыненне да гісторыі Беларусі, вядома, што пасля яго смерці ў 1927 г. частка дакументаў некаторы час захоўвалася ў нашчадкаў, але да 1930 г. праз супрацоўніка талстоўскага музея К. С. Шохар-Троцкага была перададзена ў Цэнтрархіў РСФСР. Сярод іх, па сведчанні А. Цвікевіча, быў цэлы шэраг дакументаў з асабістых архіваў дзеячаў віленскага краю, у тым ліку епіскапа Ігнація Жэлязоўскага, віленскага губернатара І. В. Галера, архімандрыта Супрасльскага манастыра Мікалая Далматава, рэдактара «Литовских епархиальных ведомостей» І. Катовіча і іншых, а таксама дакументы па гісторыі беларускіх земляў, пачынаючы з XVII ст.[8] Далейшы лёс гэтых дакументаў не вызначаны.

Па сведчанні Жыркевіча, «в дневниках Спрогиса, ведшихся им в течение десятков лет чуть ли не ежедневно, отражалась удивительно светлая личность этого человека и ученого, который не был оценен его современниками в Вильне … Будучи преданным сыном России и православной церкви, он, как природный латыш, держался того взгляда, что всякая народность, входящая в состав русского государства, имеет право на сохранение особенностей своей национальности и культуры, быть в вере, сохранившейся от предков». У дзённіках праз прызму характару, інтарэсаў, дзейнасці і менталітэту аўтара адлюстроўваецца паўсядзённае жыццё т. зв. «рускай Вільні». Па трапнай заўвазе Жыркевіча, Спрогіс ведаў толькі «дзве дарогі: у архіў да ў Божы храм», з'яўляючыся членам Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва. У дзённіках вельмі дакладна занатоўваліся ўсе падзеі царкоўнага праваслаўнага жыцця горада (рэстаўрацыя сабора, мерапрыемствы з нагоды 50-годдзя ліквідацыі уніі і інш.), свецкія стасункі (візіты, наведванне тэатра і іншых мерапрыемстваў, вяселлі, пахаванні), правядзенне навуковых даследаванняў (агляд і абмеры замка Гедыміна, склепа Віленскай Троіцкай царквы і інш.), штодзённасць (неспадзяваныя здарэнні, дамашнія клопаты, пакупкі) і, у меншай ступені, праца ў архіве (сустрэчы, набыццё дакументаў, клопаты аб іх захаванні, праца над стварэннем паказчыка)[9]. У нататках фіксуюцца толькі факты, іх аналіз і ацэнка фактычна адсутнічаюць, таму можна зрабіць вывад, што яны служылі аўтару ў якасці памяткі аб тых ці іншых падзеях асабістага і грамадскага жыцця[10]. У складзе кожнага нататніка маецца раздзел, у якім пазначана, каму і калі былі адпраўлены і ад каго атрыманы лісты. Сярод актыўных карэспандэнтаў — А. Сапуноў, Е. Раманаў, З. Даўгяла, М. Нікіфароўскі, М. Доўнар-Запольскі.

Жыццё і дзейнасць вядомага латышскага гісторыка і архівіста Б. Р. Брэжга з 1917 па 1925 гг. звязана з беларускім горадам Віцебскам, даследаванню гісторыі якога было прысвечана некалькі прац, з яго іменем звязана і арганізацыя архіўнай справы на Віцебшчыне ў пачатку 1920-х гг. Асноўная частка дакументаў асабістага архіва навукоўца загінула разам з бібліятэкай падчас бамбёжкі Даўгаўпілса ў 1944 г.[11] Сёння яго дакументальная спадчына захоўваецца ў некалькіх сховішчах Латвіі, а сведчанні аб дзейнасці — у беларускіх і расійскіх архіўных фондах устаноў[12].



У аддзел рукапісаў і рэдкай кнігі Латвійскай нацыянальнай бібліятэкі дакументы паступілі ў 1964 г. праз Міністэрства культуры ад спадчыннікаў. Гэта 190 адзінак захоўвання за 1920—1957 гг., асноўная частка якіх прыпадае на пасляваенны перыяд, маецца арыгінальны экземпляр вопісу Радзівілаўскага архіва ў Кернаўчыцах на 126 старонках, складзены ў 1750—1751 гг. У склад фонда ўваходзяць дакументы аб навуковай дзейнасці, даследаванні па гісторыі Латвіі, а таксама ў галінах метадалогіі, археаграфіі, метралогіі, гістарычнай геаграфіі і матэрыялы да іх. У тым ліку нарысы «О походе полочан на земгалов в 1106 г. и о Двинских камнях с надписями», «Полоцкие летописи», «Материалы, относящиеся к польскому восстанию 1830—1831 гг. и 1863 г. в архиве Витебской ученой архивной комиссии»[13], «Некоторые вопросы архивного дела Советской Белоруссии»[14], «Археологическая карта Витебщины», «Карта Полоцкого воеводства»[15], лекцыі «Старая белорусская письменность»[16]. Перапіска канца 1940-х — першай паловы 1950-х гг., што захоўваецца ў фондзе, вялася ў асноўным з арганізацыямі. Біяграфічныя дакументы прадстаўлены пасведчаннямі загадчыка Віцебскага губернскага архіва, прафесара Маскоўскага археалагічнага інстытута[17] і інш.

ДГАЛ захоўвае калекцыю гістарычных дакументаў, сабраную Б. Брэжгам падчас камандзіроўкі ў Польшчу ў 1928 г.[18] Гэта копіі і арыгіналы дакументаў па гісторыі, у тым ліку царкоўнай, Латвіі, Беларусі, Літвы: інвентары і апісанні Асвейскага і Люцынскага паветаў, копіі перапіскі і іншых дакументаў беларускага каталіцкага біскупа С. Богуш-Сестранцэвіча, дамовы аб ахвяраванні грошай на будаўніцтва уніяцкіх цэркваў і г. д.

Дакументы з асабістага архіва Б. Р. Брэжга паступалі ў Латгальскі культурна-гістарычны музей ў Рэзекене (радзіма навукоўца) у некалькі этапаў: асноўная частка — гэта біяграфічныя дакументы, фотаздымкі і асабістыя рэчы, што захоўваліся на кватэры навукоўца ў Рызе, перададзеныя прыёмным сынам Брэжга Аркадзем у 1981—1982 гг.; надалей папаўненне ішло за кошт правядзення пошукавых экспедыцый, ахвяраванняў знаёмых і калег Брэжга, матэрыялаў па ўвекавечанні яго памяці. На сённяшні дзень асабісты архіў Брэжга ў музеі налічвае 401 адзінку захоўвання за 1860—1991 гг.[19]

Такім чынам, можна казаць аб каштоўных дакументах па гісторыі Беларусі ў складзе асабістых архіваў, якія захоўваюцца ў сховішчах Латвіі. Дзённікі І. Я. Спрогіса даюць магчымасць даследавання шырокага кола пытанняў, звязаных з гісторыяй паўсядзённасці г. Вільня, гістарычнай навукі і архівазнаўства, царкоўнай гісторыяй. Характэрнай рысай дзённікаў з'яўляецца адлюстраванне ўзаемапранікнення рускай, латышскай, беларускай, літоўскай культур, абумоўленае канфесійнай прыналежнасцю і існаваннем такога фе-

